Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłatą pocztową uiszczono ryczałtem.

СЛОВА ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрас Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр., на 3 мес. — 4 зл., на паўгоду — 8 зл., на год — 15 зл., заграніцу ўдвая даражэй. Перамена адрэсу 30 гр.	Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 4 — Вільня, Субота 13-га кастрычніка 1928 г. — Год 1

Воўчыя сьлёзы.

Нашы чытачы ўжо ведаюць, што на абшарах Зах. Беларусі створана г. зв. „рэгіянальнае кола адзінкі“, якое за гэта лета выпрацавала пэўную праграму „аздараўленьня Крэсаў Усходніх“. Як ведама, санацыя ў адным розьніцца ад папярэдніх эндэцкіх заправілаў, што эндэкі на нашых землях нішчылі спрытна ўсе праявы беларускага сьвядомага жыцьця, не ўдаючыся ў разбор справы, душылі неміласэрдна, як толькі маглі і дзе толькі маглі — ўсякую волю да жыцьця беларускага насяленьня наагул, напоўнілі нашы землі хмарай асаднікаў і жорстка распраўляліся з „непакорнымі рабамі“. Санацыя, бачучы, што гэты спосаб нішчаньня ўсяго беларускага ня даў ніякіх вынікаў для стабілізацыі дзяржавы (бо аб гэтым, бязумоўна, толькі ідзе мова)—завялі іншы, хоць і вельмі стары, спосаб, спосаб—„divide et impera“ (дзялі і пануй). Яны падзялілі былых, здавалася, адналітых радыкалаў (ня кажам ужо аб згодніках) на надзейных і „вывротувцув“ і калі да апошніх пакінулі ўсю папярэднюю практыку, то другім перад вачыма снуюць павуценьне надзеі, ці робяць ілюзіі „ў магчымасьці паразуменьня“, „у магчымасьці нейкай беларускай працы“. Не бяз увагі на гэтыя „надзейныя“ элемэнты яны паступова ўсоўваюць хоць навет несправуджаных у сваей лёкайскай працы перад хлебадаўцамі, але ўжо залішне скампрамітаваных у вочах ня толькі беларускіх працоўных гушчаў, а навет і ў вочах інтэлігенцыі — Паўлюкевіча, Вярнікоўскага і Умястоўскага, „вынаходзяць“ і садзяць на іх месца дзікага нацыяналіста Янку Станкевіча (да якога прылучаюцца амбітныя пані), урэшце аж праз „блажэннага“ мітрапаліта Дзяніса ўцягваюць у свой круг Каўша і іншых, па чутках, перадаюць усім гэтым новым сваім служкам „круцёлку“ Т. Вярнікоўскага і г. д. Гэты-ж спосаб падзелу на надзейных і „выўратувцув“ бачым у Т-ве Беларускай Школы, у Гімназіі і г. д.

Розьніца між эндэкамі і санатарамі распаўсюджваецца далей і на стварэньне падобных ілюзіяў і ў большых шырокіх колах беларускага народу. Калі мы раней чулі аб праекце Скульскага, што да зьнішчэньня праз 50 гадоў беларусаў зусім—дык цяпер мы бачым „позытыўную“ культурна-асьветную праграму ўспомненага „рэгіянальнага кола“, якая падзяліла Гімназіі на добрыя і злыя і вынікам якое (праграмы) стаўся факт зачыненьня Гімназіі ў Радашкавічах. Апрача таго, мы бачым „kółka rolnicze“, „kasy Stefczyka“, kółka młodzieży“, „Domy Ludowe“, „Straży ogniowe“ і г. д. і г. д. Вось сколькі „дабрадзействаў“!

—·—

У апошні час мы робімся сьведкамі новых „дабрадзействаў“. Сканстатавана, што ў Заходняй Беларусі ў гэтым годзе стаўся факт вялікага недароду, даходзячага ў Віленскім ваяводзтве чуць не да катастрафальных разьмераў. І вось, дзіўная рэч, „Адзінка“ пад кіраўніцтвам абшарнікаў і буйных прамыслоўцаў паліла сьлёзы над палажэньнем беларускага селяніна. Пішуцца артыкулы ў газэтах, выносяцца пастановы „рэгіянальнага кола“, падаюцца пэтыцыі да Ураду аб дапамозе і г. д. Проста як за паншчынай—толькі рабі і ні аб чым ня думай—ўсё дасьць пан—сьпявай песьні!

Можна падумаць, што дабрадзействы санацыі дайшлі да апошніх граніц і што мы толькі павінны багаслаўляць неба за добрых апякуноў. Але калі прыгледзімся да ўсіх гэтых новапабудаваных картачных дамкоў, то ўбачым, што яны пабудаваны далёка ня з тэй мэтай, каб нам дапамагаць, не гаворачы больш (за гэта канфіскуюць!). Гэта ўсё адносіцца да новых спосабаў, якія ўводзяцца цяпер у адрозьненьне ад былых эндэцкіх. Тое самае ў роўнай ступені трэба сказаць і аб плачу над неўраджаем. Мусім прыпомніць, што такія стыхійныя беды ў нас ня першы год. Вялікая частка насяленьня Заходняй Беларусі ў леташнім годзе, напр., перажыла вялікія навальніцы з градам, якія панішчылі пасевы. Тады, асабліва ў „валаданьнях“ “найлібэральнейшага“ Навагрудзкага ваяводы п. Бэцковіча, таксама рассыпаліся дабрадзействы ў форме пазычак. А вось цяпер іх сьцягаюць назад і, як перадаюць, так неміласэрдна, што шмат каму з сялян галава закруцілася. Нашы карэспандэнцыі з вёскі як найбольш яскрава выяўляюць паказаныя „дабрадзействы“. Мы можам шмат чаго сказаць аб адваротным боку „дабрадзействаў“ на прыкладах камасацыі, барацьбы паноў з сэрвітутамі, сваяроднай парцэляцыі і г. д., але і так на мясцох гэтыя „дабрадзействы“ залішне вядомыя, каб лішні раз падрабляць газэту пад канфіскату, пішучы аб іх. Гэтая горкая праўда рэжа занадта „дабрадзеям“ вочы.

Дык што й казаць—ня гледзячы на штучныя спосабы замазаньня вачэй рознымі абяцанкамі, якія нікога не забавязваюць — ідзе шпаркім тэмпам г. зв. полярызацыя сілаў, выкопваецца, што раз большая прорва між панамі і працоўнымі гушчамі, а гэта сьведчыць аб запраўднай цане „дабрадзействаў“.

Дык што такое сьлёзы адзінкі?

Проста скажам—*гэта воўчыя сьлёзы над авечай доляй*, гэта новы спосаб кіраваньня працоўнымі шляхам стварэньня пустых надзеяў, што да палепшаньня іх быту, гэта — турботы паноў над „занадта“ ўжо вялікай сьвядомасьцю народу з мэтай прыцягнуць сымпатыі на свой бок. А што да фактычнага палепшаньня, дык на тое-ж існуе вядомая пагаворка — „цацанка-абяцанка“...

Мы павінны вельмі задумацца над спосабам *дапамогі самім сабе.* А гэты спосаб ёсьць і мы аб ім заўсёды кажам.

Будзем тварыць каапэратывы! Ясна, што раптоўна мы не паможам гору ў даным выпадку. Але мы створым умовы для магчымасьці самадапамогі ў будучыні. Каапэратыўны апарат як раз у стане змогі дапамагчы гору ў такіх выпадках шляхам прывозу па танных цэнах збожжа з ураджайных мясцовасьцяў. Ясна, што мы маем права і на дзяржаўную дапамогу і мусім трэбаваць яе, але *не як ласку, а як права.* Аднак, ня мусім забывацца на будучыню. Будзем тварыць каапэратывы, будзем самі сабе дапамагаць.

Каапэратывы — вось адказ на воўчыя сьлёзы паноў рэгіяналістаў!

Маніфэст Прыма-дэ-Рывэры.

Урадавая прэса ў Гішпаніі друкуе „Маніфэст“ дыктатара Прыма-дэ-Рывэры, выданы ім, трэба думаць — з прычыны 5-лецьця яго „жонду“. Дзіка — сьмешны маніфэст і тым напоўнены пахвальбамі—тым, што ўжо обдена дыктатарам, ды „прароцтвамі“—аб тым, як пекна будзе выглядаць „вялікая дзяржава“ Гішпанія... ў 1933 г. ў канцы другога 5 лецьця панаваньня таго ж дыктатара!... Відаць, гэнарал дэ-Рывэра паважна пэўны сваей ўлады — бо-ж „маніфэст“ зьмяшчае плян працаў яго ўраду на гэтае новае 5-лецьце! Найбліжэйшая сэсія „Народнага Сабраньня“ (эрзатц разагнанага парляманту), кажа маніфэст, мае разглядаць бюджэты... на 1929 і 1930 г. г. Весь дык „парлямант“! Гэты прынамсь выдатна працуе—ня тое, што старыя збанкрутаваныя парляманты Эўропы—адразу на аднэй сэсіі апрацоўвае бюджэты на 2 гады ўперад!... Да 1930 г. гэнарал мае цалком дакапаць „санацыйную працу“ ў краі. Надвыжкі бюджэту маніфэст абяцае выдаваць „на карысьць бяднейшых клясаў краю“... Гішпанская хэўра буйнай буржуазіі з абшарніцтвам („грандамі“), якой пакорным прыкашчыкам зьяўляецца „дыктатар“, думае за гэтыя неразьмененыя яшчэ навет на медныя грошы „цеплыя панскія словы“ купіць сабе падтрыманьне з боку бяднейшых клясаў!... Далей „маніфэст“ гучна кажа аб тым, што ўрад будзе ўсьцяж „замацоўваць карпарацыйны лад“ у дзяржаве, „сыстэму рэпрэзэнтацыі“, і — „міжклясавую гармонію і раўнавагу“... Усе гэта—добра ведамыя ўсім рэчы, дакананыя ўжо цалком у фашыстаўскай Італіі, часткова ў іншых малодшых дзяржавах—„паў-фашыстаўскіх“, — дзе краёвыя „дыктатары“ ляскаюць зубамі —з зайздрасьці на італьянскія парадкі. Гэта значыць, проста кажучы, поўнае скасаваньне ня толькі парлямантарызму, але і парляманту, творанага вольнымі ўсенароднымі выбарамі: замест яго, мае быць надалей—назначанае—часткай ўрадам, часткай прафэсіянальнымі арганізацыямі—пэўне-ж пераважна—багацэйшых клясаў насяленьня —„законадарадчае“ сабраньне, якое будзе толькі пакорна ставіць сваю пячаць над усімі праектамі ўраду. Такі зьмест „карпарацыйнага ладу“, і „сыстэмы рэпрэзэнтацыі“. Што-ж датычыць „сацыяльнай раўнавагі“ і „міжнаклясавай гармоніі“, дык ізноў і тутака крыецца ашуканства: бо-ж можна нічога ня мець навет проці гэтых „раўнавагі і гармоніі“, але калі яны ў грамадзянстве ўстанаўліваюцца вольнай барацьбой ды супрацоўніцтвам клясаў, як гэта ёсьць у дэмакратычным ладзе. Але фашыстаўскі лад, згары выключаючы барацьбу клясаў, не выключае яе — на карысьць мацнейшых клясаў: буйнай буржуазіі і абшарніцтва, якія і „робяць самі — сіламі захопленага магутнага дзяржаўнага апарату гэтыя „гармонію“ і „раўнавагу“, ад якіх у сялян і работнікаў „чубы трашчаць“...

Пасьля гэтага гэнаральскі „маніфэст“ красамоўна апісвае, якой будзе выглядаць Гішпанія... ў 1933 г. — дзякуючы працы яе дыктатара.

У 1933 г. Гішпанія будзе мець... 25 мільёнаў насяленьня: за гэта ўжо ручае сам гэн. дэ-Рывэра!... Гішпанія будзе мець дасканалую сетку чыгунак, шосы, шляхі!... Ральніцтва, прамысловасьць краю—дзякуючы электрыфікацыі-здабудзе ўсе заграічныя рынкі!... (пэўне-ж паб'е навет Амэрыку!). Фінансы будуць у парадку, валюта цьвердае, як жалеза (пэўне-ж не як мяккае золата!...). Калі Гішпанія ня зыйдзе з шляху, указанага дэ Рывэрай (або не прагоніць яго), яна—будзе багатым краем, народ яе будзе маральным, культурным, магутным; у краі будзе панаваць сацыяльны лад. Навонках Гішпанскай дзяржаве будзе забясьпечана нятыкальнасьць, пашана і—падзіў ад боку ўсіх народаў сьвету!... І ў такім „стылі“ ідзе гэты „маніфэст“ гішпанскага бясстыднага хвастуна-дыктатара да канца!... У канцы аднакжа „маніфэст“ пачынае казаць запраўдным шчырым голасам крывавага дыктатара, калі ён кідае пагрозы ў бок сваіх ворагаў. — Як ідуць чуткі з краю, ворагамі дыктатара ўсе больш робіцца ўвесь край. Дык—ці дажыве ён сам—ня тае што да 1933 г., а навет да новага 1929 г.—яшчэ пытаньне.

Па загаду Старосты Гродзкага на места Вільню, скафіскаваны № 3 газэты „Слова Працы“ за заметку з Т-ва Бел. Школы.

З работніцкай забастоўкі у Лодзі.

Як ведама, у другой палове верасьня адбылася вялізная і ўдачная для работнікаў забастоўка ў Лодзі, аб якой падрабязна пісалася ў перадавіцы 8-нумару „Рэха Працы“, за што гэты нумар і быў скандфіскаваны.

Дзеля таго, каб гэты лёс не спаткаў і „Слова Працы“, паведамляем аб гэтай забастоўцы нашых чытачоў літэральным перадрукам з польскай газэты „Robociarz“ № 24.

„Работнікі валакнянага прамыслу ў Лодзі і цэлай Польшчы прыгатаўляліся на 30 верасьня да барацьбы за палепшаньне свайго быту, за 8 гадзінны дзень працы і проці забойчай капіталістычнай „рацыяналізацыі“. Пад націскам работніцкіх масаў згодніцкія кіраўніцтва праф. саюзаў (ППС-аўцы, Хадэкі і Н. П. Р-чы) былі змушаны на адкіненьне накінутай работнікам „арбітражнае“ ўмовы. Ня гледзячы на сабатаж угоды, прыгатаваўчая акцыя йшла добра, на лічных сабраньнях, масоўках і-вечах работніцкіх паслоў работнікі выражалі сваю волю і гатовасьць да барацьбы. — Вось гэты момант лодзкія прамыслоўцы і іх саюзьнікі і выбралі дзеля спаралізаваньня распачатай акцыі. Сродкам да гэтага меўся быць новы закон аб найме работнікаў, які прадбачыць, між іншым, „абвешчваньне ў прамысловых інстытуцыях рэгуляміну працы“.

У першых днёх верасьня ў радзе лодзкіх фабрыкаў зьявіліся зацьверджаныя лодзкім інспэктарам працы „рэгуляміны“ разам з табліцай „караў“, накладаючых вельмі вялікія штрафы за найдрабнейшае „правіненьне“ работніка.

Адказ работнікаў на гэтую фабрыканцкую правакацыю наступіў зараз-жа. Аднамысна і стыхійна (żywiołowo) работнікі адказалі забастоўкай фабрык, у якіх зьявіліся фабрыканцкія рэгуляміны. Забаставала каля **4000** работнікаў. Пераважна, па аднадзённай забастоўцы фабрыканты зьнімалі рэгуляміны і работнікі прыступалі да працы. Здавалася, што атака была адбітай. Але фабрыканты ня лічылі сябе за праграўшых. У першых днёх наступнага тыдня зьявілася абвестка Саюзу фабрыкантаў, абвяшчаючая ўвядзеньне рэгулямінаў разам з табліцамі караў ва ўсіх фабрыках. Хутка наступіла і рэалізацыя. Але сьведамыя работнікі ня спалі. Зараз-жа кінулі працу, чым і далі адбой сканцэнтраванай атацы капіталу і яго саюзьнікам. У аўторак 18 верасьня баставала ўжо 30 тысяч валакняных работнікаў. Забастоўка пашыралася і пачала захопліваць за Лодзьдзю такжа Пабіянцы, Азоркаў, Згеж.

Адначасна работніцкімі масамі быў прыняты прапанаваны праф. лявіцай лёзунг, каб на фабрыканцкую атаку адказаць ад п'ятніцы 21 верасьня гэнаральнай забастоўкай, ня тольк проці фабрыканцкіх рэгулямінаў, але разам за ўсе жаданьні, як 20% падбаўкі (35% для горш платных), проці забойчай рацыяналізацыі, за 8 гадз. дзень працы і г. д.

„Лёзунг прафэсіянальнай лявіцы шыбка зрабіўся так папулярным, што яго мусілі падтрымаць навет поўныя да мазгоў касьцей згодніцтва кіраўнікі саюзаў, ведама не бяз затоенай думкі здрады гэтага лёзунгу пры першай магчымасьці. Тымчасам усе саюзы праклямавалі на 21 забастоўку аба ўсіх жаданьнях. Канфэрэнцыя дэлегатаў клясавага саюзу выбрала Забастовачны камітэт, які, складаючыся з лявіцовых дэлегатаў, зрабіўся фактычным кіраўнікам барацьбы (walki) проці і праз голавы Шчэркоўскіх, Вальчакаў і іншых Казімерчыкаў.

„Забастоўка пашыралася, абнімаючы штораз шырэйшыя масы; да забастоўкі далучыліся навет тыя катэгорыі работнікаў, у якіх ня былі вывешаны рэгуляміны і каторыя тады ня былі абхоплены няпрынятай работнікамі ўмовай (ядвабнікі, стужачнікі і інш,). 20 верасьня ў Лодзі, Пабіянцах і ваколіцах баставала ўжо, паводле лодзкай прэсы, работнікаў, хваля ўсьцяж узрасталася, ахвота змаганьня павялічвалася. Гэтага спалохаліся фабрыканты, а таксама „бэбэхаўскія“ і згодніцкая паслы і „tlumn ię“ зь [illegible] Лодзь, з мэтай патушэньня па жару [illegible]

„У выніку іх „забегаў [illegible]
тар працы „цофнуў“ рэгу

„заключаючы рад пунктаў, ня згодных з уставай". Трэба было двухтыднёвага намыслу, ну, і забастоўкі дзесяткаў тысяч работнікаў, каб было зроблена гэтае „юрыдычнае" адкрыцьцё. Гэтую сваю першую перамогу (няпоўную, бо нічым ня загарантаваную) валакнянікі прагнулі замацаваць і пашырыць, змушаньнем фабрыкантаў прыняць усе жаданьні. Але нашто-ж ёсьць згоднікі, калі не на тое, каб зьнявечыць кажды высілак работнікаў, змарнаваць каждую іх перамогу?

„Найганьбоўней, найнікчэмней пачалі пэпэасы, якія ня менш фабрыкантаў спалохаліся ўстрастаючай сілы масаў і іх волі да барацьбы. Проці выразнай волі фабрычных дэлегатаў, якія ўсемі галасамі проці аднаго выказаліся за далейшай забастоўкай за ўсе жаданьні, але Шчэркоўскі, Вальчак разам з цэлай галоўнай управай абвясьцілі прарваньне забастоўкі. Тое самае зрабілі кіраўнікі і іншых саюзаў. Ізноў згодніцтва запрапасьціла работніцкую справу, бо ясна, якую сілу мелі бы ў руках работніцкія саюзы, калі-б перагаворы з фабрыкантамі аб новай ўмове адбываліся ў абліччы стотысячнай масы бастуючых валакнянікаў, гатовых вытрымаць да перамогі, бадзёрных першай перамогай. Але гэтага якраз ня хочуць паны з ППС, (правіцы) N. P. R. і X. D., бо ў такой сітуацыі работніцкія масы ня йдуць за імі", канчае аб гэтым названая газэта. Канчаем і мы, нічога ад сябе не дадаючы...

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Паварот марш. Пілсудскага.

4 г. м. вярнуўся ў Польшчу м. Пілсудскі, які, як ведама, быў у Румыніі на летніх „фэрыях" (адпачынку). На колькі гэтыя „фэрыі" былі праўдзівым адпачынкам ад палітычнай працы, трудна сказаць, бо заграмічная прэса цьвярдзіць, што гэта было дзеля мацнейшага ваеннага „зблiжэньня" Польшчы з Румыніяй.

У Лодзі ізноў забастоўка.

У канцы мінулага тыдня ў Лодзі ізноў выбухла забастоўка работнікаў валакнянага промыслу. Забастоўку абвясьціў прафсаюз работнікаў гэтага промыслу. У сувязі з гэтым да забастоўкі былі змушаны прыступіць работніцкія саюзы „Праца" — знаходзячыяся пад уплывам ППС прав. і саюзы Хадэцыі.

Спачатку гэтыя саюзы (кіраўнікі) займалі да забастоўкі вычэкваючае становішча—быццам да суботы—да часу адказу прамыслоўцаў у гэтай справе М-ву Працы і Грамадзкай Апекі.

Але яшчэ перад суботай, урады „Працы" і Х-Дэцыі, „даведаўшыся", як піша 287 № „Rz-plitej" аб радыкальным становішчы клясавых саюзаў на груньце забастоўкі, адбылі нарады, на якіх пастанавілі далучыцца да забастоўкі, быццам дзеля адзінага фронту валакняньнікаў". Санацыйны-ж „Gł. Prawdy", гаворачы аб гэтай самай забастоўцы, падае ў 277 нумары ў поўнасьці словы пэпэсаўскага сэкрэтара „Працы" Вальчака, тлумачачага прычыны прыступленьня да забастоўкі „Працы" і Х-Дэцыі: „каб забастоўка ня выбухла міма нашай волі (!) і проці нашых „wskazań".

Такая пастанова справы—што работнікі ўжо ня лічацца з сацыял-згодай, дае магчымасьць спадзявацца, што на гэты раз бастуючыя работнікі выйдуць з забастоўкі з поўнай перамогай і ўсімі яе пасьледзтвамі—згодай прамыслоўцаў на ўсе іх дамаганьні, а ня як у першую забастоўку — з перамогай, але бяз нічога, апрача зьняцьця „табліцаў кар".

Але вернемся да самай забастоўкі — да клясавых праф. саюзаў, выдаўшых да работнікаў адозву, заклікаючую работнікаў да прыступленьня да забастоўкі. У гэтай адозьве, апрача закліку да работніка, прафсаюзы сцьвярджаюць, што ў барацьбе з прамыслоўцамі ўжо вычарпаны ўсе мірныя (палюбоўныя) срэдзтвы. Акружны інспэктарыят навет і ня патурбаваўся (пэўна ведаючы бясэнсоўнасьць) зрабіць „спэцыяльную інтэрвэнцыю", а паведаміў аб забастоўцы М-ва Працы тэлефанічна.

Па абліччэньням прэсы, вечарам першага дня забастоўкі (пятніца), баставала 75 прац. валакняньнікаў на правінцыі; 90 прац. у Лодзі; лік бастуючых работнікаў у Лодзі дайшоў да 80 тысяч чал.

На другі дзень забастоўка яшчэ пашырылася, абнімаючы ў Лодзі больш 10 тысяч новых работнікаў. Забастоўка пашыраецца, дзякуючы вечам і масоўкам.

На правінцыі забастоўка абхапіла амаль ня ўвесь промысел у Згержы, Озоркове, Здуньскай Волі, Серадзі, Петракове, Машчэніцы, Александраве, Канстантынове, Чэнстахове (1800 работнікаў) і Жырардаве.—(„R-plita" № 288).

Каліш не бастуе, бо яшчэ не атрымаў на гэта дазволу ад работніцкіх уладаў.

На апошнім паседжаньні забастовачнай камісіі ўсталена, што бастуе 99 прац. фабрыкаў.

На трэці дзень забастоўкі, па доўгай нарадзе ў М-ве Працы і Грамадзкай Апекі міністр Юркевіч запрапанаваў работнікам (і працадаўцам) прыняць вызначаную ўрадам 5 прац. падбаўку, а рэшта работніцкіх дамаганьняў маецца быць дабравольна ўзгоднена на бяспасярэдніх работніцка-прамыслоўскіх канфэрэнцыях.

Але, мусім дадаць, што ні ў каго няма ніякай надзеі на магчымасьць прыняцьця работнікамі гэтай ирапановы.

Пагроза яшчэ адной вялізнай забастоўкі.

Прэса інфармуе, што цэнтральны камітэт вуглякопаў Дамброўскага і Кракаўскага басэйну („Заглэмбя"), зажадалі ад прамыслоўцаў падбаўкі платы, якая прызнана вуглякопам Верхняга Сьлёнску. На гэтыя жаданьні прамыслоўцы адказалі згодай толькі на 35 прац. падбаўкі, якую работнікі адкінулі, заяўляючы пры гэтым, што астаюцца пры сваім жаданьні — прызнаньні ім падбаўкі прынамсі такой, як і на В. Сьлёнску.

Адказам на панскую падбаўку—35 прац. зьявілася пастанова цэнтральнага саюзу работнікаў заклікаць вуглякопаў кракаўскага і дамброўскага басэйну да забастоўкі, тэрмін пачатку якой будзе вызначаны цэнтральным саюзам гарнякоў.

Італьянская забастоўка ў чыгуначных варстатах.

Надовячы ў чыгуначных (kolejowych) варстатах Варшава-Прага было зрэдукавана 50 варстатных работнікаў і, апрача гэтага, абвешчана, што 15 г. м. будзе зрэдукавана яшчэ 90 работнікаў. Работнікі склікалі даразную масоўку, на якой пастаноўлена абвясьціць італьянскую забастоўку (прыйсьці на работу, але не працаваць), да якой адразу і прыступілі.

З сялянскага прафсаюзнага руху.

Вызыск сялянскае беднаты „панамі"-абшарнікамі цяпер усюды проста нячуваны, асабліва ў Зах. Беларусі, дзе няма сялянскіх праф. саюзаў. Наскол́ькі гэтыя прафэсіянальныя саюзы патрэбны, паказвае тое, што, дзе яны паўстаюць, адразу яны шляхам законных забастовак паляпшаюць умовы жыцьця. Напр. да гэтага часу, калі на Украіне ня было сялянскіх праф. саюзаў, сяляне касілі „панскую" атаву на пятую частку (4 паву 5-ая капа сабе). У гэтым-жа годзе з'арганізаваныя ў прафсаюз сяляне Пацячычаў правялі забастоўку і дабіліся ею таго, што косяць атаву на палову, або трацяк. („Сель-Роб" № 62-63).

Трэба, каб працоўныя беларускія сялянскія гушчы, як жывучыя ў вёсках і быццам ня служачыя паном, так і дворскія работнікі з'арганізаваліся ў сялянскія прафэсіянальныя саюзы. Гэта пазволіць ім пашыраць прадбачаныя законам забастоўкі, забясьпечыць іх перад так-званымі „страйкаламамі" і дасьць магчымасьць пасьпешна змагацца з красуючаю ў нас угодаю і панскім лёкайствам.

Дзеля гэтага сяляне і дворскія парабкі-батракі—павінны, як мага, арганізаваць свае клясавыя прафсаюзы дзеля барацьбы з немагчымым ужо вызыскам—80 грашоў платы за 14-16 гадзінны дзень працы!

Алярмуючая сялянская забастоўка.

65 нумар украінскай часопісі „Сель-Роб" падае наступную вестку аб сялянскай забастоўцы.

„Забастоўка ў Дзебах, Раўскага павету, трывае ўжо 5 тыдняў і абхапіла ўсе акалічныя сёлы. Абшарнік справадзіў „ламістрайкаў". Яны пры першай дэманстрацыі далучыліся да бастуючых, аднак, па намове паліцыі і пад яе абаронай ізноў выехалі з плугамі ў поле.

Калі на палях зьявілася бастуючая сялянская маса, паліцыя і страйкаломы на конях кінуліся на спакойных сялян. Завязалася бойка. З абодвых бакоў 11 цяжка раненых. У сяле выняткавае становішча. Забастовачны камітэт выдаў да ўсіх працоўных адозву, у якой выясьняе, за што змагаюцца бастуючыя і заклікае іх выдзяржаць у барацьбе за свае дамаганьні.

Зачыненьне прафсаюзаў у Ковелі.

Украінская прэса інфармуе, што польская ўлада зачыніла ў Ковелі ўсе прафсаюзы, пры чым, прэса адзначае, што ковельскія прафсаюзы выяўлялі сваю жывучасьць у арганізаваньні працоўных масаў.

Безрабоцьце ў Польшчы.

Лік безработных, зарэгістраваных у Дзяржаўным Урадзе Пасярэдніцтва Працы на 1 верасьня г. г., раўняўся агулам 88,593, з якіх атрымлівае запамогі толькі 28,048 чал.

Прыгожая статыстыка.

Прэса польскіх санатараў любіць хваліцца, што адносіны ў Польшчы лепшаюць што-году, але вось статыстыка кажа штось адваротнае — напрыклад: судовых спраў за фальшаваньне грошай было ў Польшчы: ў 1923 г.—108, у 1924—156, у 1925 — 531, у 1926—17,591, у 1927—43,083.

Забойстваў, рабункаў, уламаньняў і вялікіх крадзяжоў: у 1925 г.—28,601, у 1926—34,082, у 1927—37,028. („Наша Слово" № 39).

Бурлівая забастоўка.

У Радомску пачалася забастоўка работнікаў у фабрыках гнутай мэбелі. Бастуе ўжо 2000 работнікаў. Прабег забастоўкі бурлівы. Работнікі фабрыкі „Масовія" і „Віншо", у ліку 1700 чалавек, намерваліся прабіцца на фабрычныя абшары братоў Таннэт і С-ка ў Ксаверове, але іх разагнала, закліканая дырэкцыяй паліцыя. Пасьля гэтага работнікі сабіраліся яшчэ некалькі разоў, каб прабіцца на фабрычныя абшары. Некалькі работнікаў арыштавана. Забастоўка пашыраецца.

(„Głos Prawdy" № 278)

Важны палітычны працэс.

Варшаўскі судзьдзя для спраў асаблівай важнасьці Тодар Вітуньскі ўжо закончыў сьледзтва ў галоснай справе Вайцяхоўскага, рас. эмігранта, замахоўца на прадстаўніка савецкага гандлю Лізарава.

Працэс пачнецца ў пачатку лістападу г. г. у салі Акружнага Суда ў Варшаве. На суд будзе паклікана каля 20 сьведак.

Заграніцай.

Выбары ў Латвіі.

7./X. у нядзелю адбыліся агульныя выбары ў латвійскі парлямант. Працэнт галасаваўшых быў вельмі значны—каля 90 проц. Пакуль што ведамы толькі рэзультаты выбараў з рыжскага вокругу. У сталіцы—19 мандатаў—сацыял-дэмакраты здабылі — 5 манд., камуністы—3 ман., немцы — 3 ман., латвійская правіца—2 ман., сялянскі саюз—1 ман., цэнтр — 2 ман., жыды і расейцы па 1 манд. Прэса падчырквае перамогу камуністаў, якія адабралі свае 3 мандаты ад сацыял-дэмакратаў.

З правінцыі няма яшчэ дакладных вестак. Наагул, прэса не прадбачыць значных зьменаў у укладзе партыйных сілаў у парляманьце. Спадзявана толькі значная страта мандатаў сацыял-дэмакратамі — на карысьць камуністычных прафэс. работн. саюзаў (каля 10 мандатаў!..). Такое раздрабленьне лявіцы, цьвердзіць прэса, значна ўмацуе права-цэнтровую буржуазную большасьць парляманту.

Дзень 7-га кастрычніка ў Аўстрыі прайшоў спакойна.

У апошні мамэнт аўстрыяцкая ўлада скасавала забарону сацыялістычнага зьезду, але за тое — прыняла ўсе меры, каб папярэдзіць магчымасьць крывавых сутычак. На места Вінэр Нэйштадт пастаўлена 8.000 жаўнераў усялякага роду аружжа. Сам ваенны міністар зрабіў пэрагляд гэтаму войску. Навакол места разьмешчаны ў баявой гатоўнасьці батарэі гарматаў. Усе жаўнеры мелі навет газавыя маскі. Усе ўрадавыя гмахі ў месьце заняты былі жаўнерамі, асабліва — паштовыя і тэлеграфныя ўстановы. На ўсіх станцыях чыгункі, навакол места створаны былі асобныя камітэты, зложаныя нароўні з

Куды ня кінь — усюды клін.

(Апавяданьні дзядзькі Рыгора).

У нядзелю раніцай каля касьцёлу сабралася грамадка сялян. Пакурвалі, гутарылі аб тым, аб сім. Бядавалі, што вялікія падаткі плаціць трэба, а тут няма з чаго: няўроды, зямлі мала, граша зарабіць няма дзе.

— Хоць ты, чалавек, жывы ў зямлю лезь! I дасюль было ня лёгка, а цяпер дык і зусім кончылася! — прагаварыў ужо наджылы селянін.

— Даўней ты каля гаспадаркі балтаешся, а хлапцы, як запахне вясной, пашлі ў бурлакі, па гарадох! I сябе пракормяць—апрануць і табе дапамогуць; падаткі заплоціш, каралям, краўцам і на чорны дзень яшчэ рублёўку прыгарнеш, а цяпер... Эх-хэ-хэ! Некуды людзям дзецца — забіліся на вёску, быццам у мяшок які. Цесната, зямлі мала, калі хто яшчэ мае пяток дзесяцін, дык багатыром лічаць! Вось тут і рабі, што хочаш і разьвярніся! Есьць людзям нечага, а тут сваім чарадом як давай, так давай. А з чаго даць, каб хто спытаў!

— Э, зямлі то ёсьць, браткі, хапіла-б для ўсіх — адазваўся другі — Лысагорскі пан прадае ўсе свае фальваркі, але адкуль узяць грошы?—вось пытаньне. За адну дзесяцінку сто рублёў золатам просіць! А зямля-ж, зжалься божа — пяскі ды балоты.

— Вядома прадае тое, што яму не патрэбнае — зацеміў першы.

— Хоць і кепскай, а ўсё-ж каб меў-бы свой кусочак дзесяцінак васьмярню не гараваў-бы так, як цяпер.

Б'ешся па гэтых запашках, працуеш на людзей, а прыйдзе вясна — і есьць нечага! — сказаў худзенькі, у зрэбных хварбаваных портках, сярэдніх лет мужчына.

— Пэўне-ж не гараваў-бы, каб меў свой кусочак, ды нікому за яго не плаціў, але як я вось купіў дзесяць дзесяцін, дык і ня ведаю — ці я яе абдужаю, ці яна мяне ў дамавіну загоне — загаманіў басам высокі сутулы селянін, гадоў прыблізна 45-х.

— Васпанава-ж і зямелька, здаецца, ня кепская — пры гліцы, а лужок гэтакі залівны! — заўважыў худзенькі ў зрэбных портках і прымружыўшы вочы ажна ўсьміхнуўся, мусіць бачачы гэты кусочак і сябе яго ўласьнікам.

— Ня кепская! Пачакайце, калі хочаце дык раскажу вам, людцы мае, пра сваё гора—бяду, раскажу, як лёгка мне купляць гэты кусочак — тагды скажаце — добры! Ел ужо мне вось тут, напярок горла стаў гэты кусочак.

— Раскажы, раскажы, дзядзька Рыгор! прасілі маладыя хлапцы.

— Ну Рыгор, то ўжо як заўдзе — нагавора праўды і няпраўды ды, яго толькі слухай! — заўважыў барадаты.

— Хоць і збае, але гладка. Ты вось гэтак не патрапіш — падсек яго сусед.

— Дык вось, людцы мае, — пачаў дзядзька Рыгор — як вядома, засталося нас пасьля бацькі пяць братоў. На шасьцёх дзесяцінах цесна — разбрыліся хто куды, спакінуўшы іх старшаму Хвёдару. Нагаварвалі мяне ў горад пайсьці. Што, думаю, там я рабіць буду? Нічога ня ўмею, апрача, як гараць гэту зямелку шэрую. Хадзі там, думаю, кожны дзень з торбай купляць хлеба, нераўнуючы, як жабрак які! Выдзяліў мне брат канішку, каравёнку, саху, барану і пайшоў я са сваей Агатай па запашках, па арэндах цягацца. Дзе нас ня было! Ажна вось ужо вайной лучылі сюды ў Круш-Поле.

Працы, людцы мае, усюды хапала, але ўжо біў зажыўшы са тры кароўкі і канька добрага. Бывала масла, кабанка якога выгадаваўшы прадасі — зьбіраеш грош на арэнду пану, але ўсё-ж і табе сырабужка астаецца, ды і хлеба заўсёды хапала. Аж тут наляцела вайна: то немцы, то такія, то гэтакія — чыста разграбілі! Адна кароўка засталася, але пасьля, як усё гэта ўспакоілася, ізноў дагадавалі чатыры хвасты.

Пан дзесь прапаў, казалі ажна ў Пазнань нейкую зьехаў, арэнды нікому не плацілі, дык нам і зусім лёгка стала. Сядзім вечарком з Агатай і цешымся, што прыбывае наша гаспадарка, — багацеем.

Ажна прылятае пан! Зашчаміла мне за сэрцайка, гаворым з бабай, што-небудзь ды будзе. Ажна праўда, пазывае мне пан і кажа, што хоча прадаць Круш-Поле.

— Панок, кажу, а куды-ж я падзенуся з малымі дзеткамі?

— А маё якое дзела — кажа — хоць ты пад плот. Купляй! Як для цябе, ацаню ня дорага — па 120 рублёў дзесяціну. Трэцюю частку дасі цяпер, а рэшту выплаціш за два гады — пачакаю. — Прыйшоў дамоў і цераблю патыліцу. Парадзіўся з жонкай.

— Куды ты — кажа — цяпер скочыш? Цесната гэтакая стала ўсюды ды і абрыдла ўжо цягацца на сьвеце. Дзеткі паднімаюцца — хай мелі-б свой куточак... Можа як выплаціш? —

Пацягнулі на кірмаш кароў, вытрасьлі ўсе кашукі і так-сяк згарусьцілі пану задатак.

— Вось і дзякаваць богу — утарнуўся худзенькі.

— Ня дзякуй, а слухай, што далей будзе, думаеш на гэтым і канец? Не брат! Напісалі кантракт: — Калі не заплаціш у срок другую, або трэцюю частку, дык урэсь твой задатак прападае і пан мае права прадаваць зямлю другому. — Вось як!

Тут, людцы мае, і круціся, як той акунь на патэльні.

Пачуў што ў цане лён. Ну думаю: пасею-ж і я пудоў пяток, а ну-ж і вырасьце! Зарадзіў добра. Прыслухваюся ўвосень — па сорак зл. кажуць пуд. Давай хутчэй мяць ды на рынак. Адзін жыд суліць 20-ць, другі 15-ць і, хоць ты ім у лоб стрэль, не даюць больш! Аддзешавеў, думаю, пачакаю яшчэ. Ажна чую: яшчэ дзешавей стаў, а тут ужо і люты на насе — пану плаціць трэба.

Ня сплю ночы цэлыя — грызе думка: скуль узяць грошы. Агата мая ажна пастарэла, бедная, сумная стала і навет рэдка гавора са мной. Віджу, што і яе смокча гэта самае за сэрца.

Дзе тонка, там, кажуць людзі, і рвецца — так і са мной, людцы мае, сталася!

Раптам, прысылаюць ад земства паперыну, а на ёй, ай бажухны! — ажна мае валасы дубам сталі! Аплаты канцэлярскай 52 зл., папяровых 95, гэрбовых ды яшчэ там нейкіх і ўсяго на 200 зл. з гакам! Падай у сямідзённы срок! Паляцеў да суседзяў. Людцы, кажу, браточкі, ратуйце—пазычце грошы!

— З радасьцяй — кажуць, каб мелі, але нічога яшчэ не прадавалі, а запас які быў, як і самому ведама, прапаў, толькі вось кніжка касавая бадзяецца. —

Вярнуўся дамоў і чуць ня плачу. Нечага рабіць, узяў сем пудоў лёну, апошняе парасятка і павёз на кірмаш. Чуць-чуць раставарыўся, аддаў, ведама, без цаны, але што, чалавеча, парадзіш? Еду дамоў і цешуся яшчэ, што маю чым адпіхнуць гэту бяду!

— Але-ж яшчэ большая вісіць над галавой—зацеміў барадаты.

Вот тое-ж, людцы мае! Некалі чакаць добрай цаны—прадаў увесь лён, знайшоў так-сяк купца на сена, прадаў новы кажух, самаварчык—застаўся як, нераўнуючы, пасьля пажару, а 300 зал. усе роўна не хапае. Хаджу быццам у хваробе якой і есьць навет ня хочацца. Выйду, гляну на гэты, як вы кажаце, кусочак, а табе зараз і жыгне думка.—Ня твой, ня твой! Пражане пан!

Апастылеў ён мне, зрабіўся горкі, як палын, і ня рад, што чапаўся за яго. Пайду даваць цялушцы, увіджу парожны хлеў—тут зноў, як нажом, у сэрца, кальне! Гладжу яе, а ў самога сьлёзы коцяцца, як гарох! Прыдзецца—думаю—і гэту прадаць, апошнюю, а які-ж я тагды гаспадар, калі і карэнь вон?

Лягу спаць—сьніцца, што паліцыя вырывае мяне з хаты, панаехаўшы якіясь людзі—сьмяюцца. Агата з дзяцьмі галосіць, і так зробіцца цяжка на грудзёх, быццам хто камянём іх націсьне.

Дайшло, людцы, да таго, што і жыцьцё навет абрыдла. Зачаплю, думаю, пятлю на шыю і ўсяму гору канец будзе.

Можа і гэтак зрабіў-бы, але пашкадаваў дзетак. Пойдуць, думаю, з торбамі па сьвеце, будуць абіваць чужыя парогі!

Засох, змарнеў зусім. Раней пяць пу-

сацыял-дэмакратаў і з нацыяналістаў. У месьце цалком забаронены гандаль усялякімі сьпіртавымі напоямі.

Але можа лепш за ўсе гэтыя меры падзеяль на ўсьмірэньне баявога духу фашыстаў тое, што сяброў іх баёвак — „Гэймсвэру“ зьехалася ўсяго 18.000, тады, як работніцкага „Шутц-бунду“ набралося — аж 70 тысяч...

Паход „Гэймс-вэру“ адбыўся раніцай; пасьля чаго—ад поўдня пачаўся ўжо паход „Шутц бунду“, у якім прынялі ўчасьце ўсе павадыры аўстрыяцкай сацыял-дэмакратыі — з старшынёй венскага магістрату на чале.

Уноч напярэдадні кангрэсу і паходаў венская паліцыя арыштавала шмат камуністаў, якія наагул заклікалі да рашучай акцыі проці фашыстаў. Пры вобысках канфіскавана аружжа, паміж іншым у чыгуншчыкаў забрана 72 стрэльбы. Усяго арыштавана ў месьце 200 камуністаў. Паліцыя не дапускала ў места ўсьцяж над'яжджаючыя партыі камуністаў з іншых местаў, адсылаючы іх назад. На другі дзень паліцыя выпусьціла арыштаваных камуністаў, толькі 5 з іх, як чужаземцы, маюць быць высланы з краю.

Прэса піша, што добрым рэзультатам усіх гэтых трывогаў і перапалоху ў краі мае быць рашучая пастанова — даканаць агульнае разбраеньне ўсіх гэтых баёвак — як фашыстаўскай таксама і работніцкіх. Як ведама, сацыял-дэмакратычная партыя сама першая высунула гэтае дамаганьне.

Прэса падлічае, што абедзьве маніфэстацыі—фашыстаўская і выклІканая ёй контрманіфэстацыя сацыялістычная — разам з выдаткамі ўраду на мабілізацыю войска і паліцыі—каштавалі краю ўсяго 2 з паловай мільёны шылінгаў!

8./X. арыштаваны 3 сябры цэнтр. каміт. аўстрыяцкай камуністычнай партыі.

Камуністычны Шульц—замест сацыялістычнага Шварца!

(Сэнсацыйнае здарэньне ў Бэрлінскай радыё-станцыі).

Увесь Бэрлін парушаны характэрным здарэньнем на бэрлінскай радыё-станцыі — у апошнюю суботу.

Праграма радыё ў гэты дзень прадбачыла, паміж іншым, лекцыю рэдактара сацыял-дэмакр. газэты „Форвэртс“ Шварца — аб забясьпячэньні міру. Перад лекцыяй за тав. Шварцам прыехаў аўтамабіль, які завез лектара—замест радыё-станцыі—далёка ў поле і там высадзіў... А тым-часам камуністычны пасол Шульц зьявіўся на станцыю ад імя Шварца, і сказаў у мікрафон вострую агітацыйную прамову—проці будаваньня... сацыялістычным урадам Мюлера новых браняносцаў для нямецкага флёту!..

У часе прамовы Шульца да кіраўніка радыё-станцыі ўсьцяж званілі па тэлефону розныя асобы (камуністы!), якія перашкаджалі яму сачыць за тым, што казаў Шульц... Такім чынам, калі той — пасьля паўгадзіннай прамовы — скончыў, дырэктар радыё, ня ведаючы падступу, хацеў навет заплаціць камуністычнаму „заступніку“ сацыял-дэмакратычнага лектара ганарар за яго лекцыю. Але той—адмовіўся, падзякаваўшы дый высьветліўшы тут-жа адкравенна, што ён ня Шварц, але Шульц, не сацыял-дэмакрат, але камуніст. Сваю „штучку“ пас. Шульц вытлумачыў тым, што ён змушаны быў ужыць падступу—бо бэрлінскае радыё дапускае прапагандавыя прамовы і лекцыі ўсіх партыяў, апроч камуністаў.

Дырэкцыя радыё была так агарошана гэтым высьвятленьнем Шульца, што дала яму спакойна адыйсьці, ня спісаўшы навет пратаколу!..

Назаўтра камуністычныя газэты таксама адкрыта высьветлілі ўсю справу. Пасол Шульц—пасьля лекцыі—цэлую ноч і наступны дзень прасядзеў у гмаху Рэйхстагу (парляманту), каб скарыстаць з закону, які кажа, што па ўплыве сутак пасьля праступнага акту пасол цалком атрымоўвае сваю пасольскую нятыкальнасьць...

Сацыял-дэмакратычная прэса, зразумела, страшэнна абураецца на камуністаў за іх „штучку“. Дэмакратычная прэса піша, што вываз сацыялістычнага лектара ў поле дый замена яго камуністам сам па сябе „добры дасьціп“, толькі-ж адначасна гэта — зьдзек над дзяржаўнай уладай і законамі...

— —

Калі ўначы з нядзелі на панядзелак пас. Шульць ехаў да сябе дамоў пад'земнай чыгункай, яго пазнаў другі рэдактар „Форвэртс'а“ і кінуўся, каб яго пабіць. Пачалася бойка, якая скончылася пратаколам, дый мае перайсьці ў суд.

„Тайныя ўмовы паміж нямецкім „рэйхсвэрам“ і радавым урадам — у справе збраеньняў“.

У чаловым органе нямецкай сацыял-дэмакратыі — „Форвэртс'е“ — адзін з паслоў Рэйхстагу зьмясьціў сэнсацыйныя рэвэляцыі аб быццам падпісаных у свой часе і выконваемых усьцяж „тайных умовах“ паміж нямецкім рэйхс-вэрам (мін. абароны) і радавым урадам. Умовы датычуць быццам варункаў будаваньня на нямецкія грошы фабрыкаў самалётаў у СССР. Запраўдная сутнасьць умоваў была быццам замаскавана так, што ў тэксьце яе стаяла нешта зусім іншае.

Прапазіцыя „аўстрыяцкім таварышом“ з боку італьянскіх фашыстаў.

Венская сацыялістычная прэса цьвердзіць, быццам перад 7 кастрычн. італьянскі пасол у Вене тройчы заяжджаў да прэм'ера Зэйпля, усьцяж прапануючы яму—„дапамогу“ ў дзень 7/X... Дык—ня толькі баварскія, але і рымскія фашысты ўжо „пацiралі рукі“,—ляскаючы зубамі на аўстрыяцкія „перспэктывы“.

Італьянскае пасольства ў Вене, зразумела-ж, зараз-жа занярэчыла гэтай весткі.

Рэзалюцыя кангрэсу англійскай „Партыі Працы“.

Кангрэс англійскай работніцкай партыі ў Бірмінгэме прыняў, паміж іншымі, рэзалюцыю ў міжнародавых справах, якая трэбуе—каб англійскі ўрад згадзіўся на перадачу ўсіх міжнародавых канфліктаў на вырашэньне палюбоўных судоў, каб скасаваў англафранцускі „кампраміс“ у справе марскіх збраеньняў і—каб адклікаў англійскія акупацыйныя войскі з Надрэніі.

Пашырэньне забастоўкі ў Аўстраліі.

Цэнтральны забастовачны камітэт у Мэльбурне—у адказ на тактыку працадаўцаў і ўраду—пастанавіў пашырыць забастоўку на іншыя галіны працы. Ен зьвяртаўся да шофэраў і кандуктараў на самаходах і аўтабусах, каб яны адмовіліся перавозіць тавары, выгружаныя з параходаў „дабравольцамі“-штрэйкбрэхэрамі, заступіўшымі прафэсіянальных рабачаў.

Амэрыка ўсьцяж не прызнае англа-францускага паразуменьня.

У Лёндане вельмі занепакоены тым, што амэрыканскі ўрад усьцяж не прызнае паразуменьня, падпісанага паміж Англіяй і Францыяй у справе „супрацоўніцтва ў разбраеньні на моры“. Копія (ці дакладная, гэта—іншая рэч) трактату, перасланая амэрыканскаму ўраду, усьцяж астаецца без адказу... Англійская адміралiцыя гатова быццам пераглядзець трактат з Францыяй, каб узгодніць яго з паглядамі Амэрыкі. Але быццам Францыя на гэта не згаджаецца.

Адказ Чычэрына на прамову Брыяна.

Як ведама, Брыян у сваей прамове проці Мюлера востра зачапіў „мімаходам“ радавы ўрад, якому закідаў усьцяж узрастаючыя збраеньні, які робіць немагчымым разбраеньне Эўропы, якая так страшна „жадае“ гэтага. Чычэрын — у тэлеграме да агенства Хірота — заяўляе свой пратэст і абурэньне проці „рэтарычнай атакі“ з боку Брыяна, дадаючы, што гэткі няслушны напад можа толькі пагоршыць стасункі між С. С. Р. Р. і Францыяй.

Палепшаньне радава-афганскіх стасункаў.

З Масквы пішуць, што ў апошні час значна палепшыліся стасункі між Радамі і Афганістам. Быццам гэтаму шмат дапамог памершы нядаўна нямецкі пасол у Маскве граф Брокдорф-Рантцаў, які нахіліў нямецкі ўрад націснуць у Кабуле на афганскі ўрад, дзе немцы маюць значныя ўплывы. Ад новага году ўваходзіць у жыцьцё новая гандлёвая ўмова з Афганістанам. Адным з ад'знакаў палепшаньня стасункаў зьяўляецца дазвол афганскага ўраду на далейшую будову шасы ад Кабулу да расейскай граніцы, маючай вельмі важнае значэньне для гандлёвага і ўсялякага збліжэньня абодвух краёў. Будова шасы была ў свой час устрымана пад націскам Англіі.

Прэзыдыум Выкан. Камітэту III Інтэрнацыяналу.

Радавая прэса даносіць, што Выканаўчы Камітэт III Інтэрнацыяналу зрабіў выбары свайго прэзыдыуму. У склад апошняга ўвайшлі, паміж іншымі — Барбэ, Бэль, Бухарын, Гатаяма, Галараў, Бэла-Кун, Кузінэн, Лазоўскі, Мануільскі, Молатаў, Мюсо, Пруханяк, Пятніцкі, Рэмэль, Сэмар, Сэрра, Сталін, Тэльман, Хітараў, Кляра Цэткіна, Шмэраль і Эмбэр. Польскія камуністы—Ленскі і Пурман папалі ў кандыдаты. Польская кам. партыя наагул мае 3 прадстаўнікоў — на 38 сяброў прэзыдыуму! Прэзыдыум, з свайго боку, выбраў цясьнейшы „палітычны сэкрэтарыят“ Інтэрнацыяналу. У склад яго ўвайшлі—Барбэ, Бэль, Бухарын, Кузінэн, Молатаў, Пятніцкі, Рэмэль, Сэрра, Чыў-Віто, Шмэраль і Эмбэр. Мануільскі, Лазоўскі і Хітараў папалі ў кандыдаты.

„Забастоўка ў Лодзі і Масква“.

Пад такім загалоўкам зьмяшчае „Кур. Варш.“ тэлеграму з Масквы, — быццам маскоўскія газэты падаюць на першым месцы сэнсацыйныя весткі аб забастоўцы ў Лодзі. Па маскоўскім інфармацыям, у Лодзі бастуе каля 150 тысяч работнікаў—ня толькі ў валакнянай прамысловасьці, але і ў іншых фабрыках. Да бастуючых усьцяж далучаюцца новыя ўстановы. „Рабочая Газэта“ піша, што абавязкам расейскага пралетарыяту ёсьць падтрыманьне польскіх братоў-работнікаў“.

Камуністы дапушчаны да выбараў прэзыдэнта ў Злучаных Штатах Амэрыкі.

„Роботнік“ зьмяшчае тэлеграму з Нью-Іорку:

„Найвышэйшы Суд у Вашынгтоне, разглядзеўшы справу (скаргу?) камуністычнай „Работніцкай Партыі“, прызнаў яе права выступаць на выбарах прэзыдэнта“.

Разрыў кітайска-японскіх перагавораў.

Японскі ўрад пастанавіў перарваць перагаворы з Нанкінскім урадам — пакуль той не адмовіцца ад сваей заявы аб тым, што Кітай лічыць страціўшым сілу кітайска-японскі трактат, накінуты Кітаю ў час яго слабасьці.

Наша хроніка.

Справа пасольскіх мітынгаў. Як ведама, ужо некалькі мітынгаў, аб якіх стараліся паслы Беларускага Сялянска-Работніцкага Клюбу, не дайшлі да скутку. Суадказныя старасты адсылалі паслоў да ваяводаў. Цяпер паслы зьвярнуліся да Віленскага і Навагрудзкага ваяводаў на цэлы рад мітынгаў. Найбольшыя шансы мае адбыцьцё мітынгу 14-га кастрычніка (на праваслаўныя Пакровы) ў асадзе Жалезьніца, Баранавіцкага пав., дзе маюць выступіць паслы — Я. Гаўрылік і Ф. Валынец. Есьць надзея на атрыманьне дазволу ў Беластоцкім і Палескім ваяводзтвах. Вось як цяпер—лягчэй таму вярблюду праз вушко іголкі пралезьці, як паслом Беларускага Сял.-Раб. Клюбу дабіцца права зрабіць навет справаздаўчы мітынг!

Надзвычайны Агульны Сход Т-ва „Пчала“. Управа Беларускага Каапэратыўнага Т-ва „Пчала“ гэтым паведамляе, што дня 22-га кастрычніка а гадз. 6 увечары ў пам. Беларускага Каапэратыўнага Банку вул. Віленская № 8 адбудзецца Надзвычайны Агульны Сход сяброў Т-ва „Пчала“, **на які ветліва просіць прыбыць, як усіх сяброў Т-ва, так і ўсіх зацікаўленых разьвіцьцём пчалярства.**

Парадак дня: 1) Адчыненьне і выбары прэзыдыума. 2) Справаздача Управы. 3) Перавыбары Нагляднай Рады. 4) Апрацаваньне пляну працы на 1929 г. 5) Справа прыняцьця ўдзелу ў Агульна Славянскім Зьезьдзе Пчаляроў у Пазнані. 6) Справа ўступленьня Т-ва ў Рэвізыйны Саюз. 7) Упаважненьне Нагляднай Рады і Управы да крэдытаваньня і вызначэньня сумы крэдытаў. 8) Бягучыя справы.

Управа.

Працэс Грамады ў апэляцыі. Абаронцы засуджаных дзеячоў Белар. Сял.-Раб. Грамады, адвакаты — Сьмяроўскі, Эттынгер, Дурач і інш. унясьлі апэляцыю на прыгавар суду першай інстанцыі, дамагаючыся да віленскага прыгавору застасаваньня амнэстыі. Апэляцыйны працэс Грамады адбудзецца, прыпушчальна, у сьнежні месяцы гэтага году.

Адкрылі і „завесілі“. Пасьля нашай заметкі аб завешаньні гуртка на Новым Сьвеце ў Вільні—з памяшчэньня гуртка зьняты пячаткі, як кажуць, у сьпешным парадку. Гурток функцыянуе нармальна. Затое сталася іншая рэч. Акружная Управа Т-ва ў Вялейцы ўжо пасьля нашай заметкі ўзапраўды прычынена („завешана“).

Ці гэта так непакояць кагосьці нашы заметкі, ці гэта можа „цікавы“ плян падгатоўкі да будучага агульнага зьезду Т-ва Беларускай Школы ў Вільні? Можа пасол Валынец, які жыве ў Вялейцы, зельмі ўжо ўбіўся камусьці ў вочы? Ці можна думаць аб такой дзіцячай наіўнасьці прыдаваць увагу аднаму чалавеку, калі ўвесь народ у сваіх думках адналіты? Праўда—„дзівосы і сьмяхоты“.

„Беларусізацыя царквы“. Як даведваемся, Каўшоўцы разам з іх суфлёрамі дабіліся ад мітрапаліта права „беларусізаваць“ невялічкую Пятніцкую царкву ў Вільні. Як кажуць, з гэтаю царквою зьвязаны пэўны маёнтак і дамы. Вось, відаць, на што яны галяцца. Аднак, „истинно-православныя“ з арцыбіскупам і кансісторыяй на чале спраціўляюцца загаду мітрапаліта, перасылаючы справу ад аднаго да другога. Проста як у апэратцы! Думаецца, што спрытныя каўшоўцы пераможуць, недарма-ж „зьмена курсу“.

Проста ашчасьлівяць беларусаў!

Арышт сэкратара Вялейскай Акружной Управы Т-ва Бел. Школы. На мінулым тыдні арыштаваны сэкратар Акружной Управы Т-ва Белар. Школы ў Вялейцы, грам. Ю. Усьціновіч. На гэты раз арышт адбыўся не на грунце палітычным і навет не як учасьніка падзеі, а як прысутнага пры ёй. Аднак, „сесьці“ лёгка, а „ўстаць“ ня так ужо лёгка. А можа й гэта адносіцца да будучага зьезду. Хто іх разьбярэ—гэтыя новыя спосабы „працы на мясцох“!

„Гумар„ „Віеł. Кгупісу“. „Віеł. Кгуpіса“, падаючы заметку аб адносінах Белар. Сял. Раб. прэсы да парляментарызму — „лукава“ заўважае: „Сапраўдны парляментарызм, як ведама, адкідваюць прыхільнікі абсалютнага манархізму, бальшавікі і фашысты. Няўжо-ж „Слова Працы“ стаіць за абсалютную манархію або фашызм“?

Магчыма, што для „Віеł. Кгупісу“ здаецца такі спосаб выказваньня думак і вельмі ўдалым, але нам здаецца, што гэта подобна да дзіцячага адбіваньня з-за вугла. Падамо восьжа да ведама „Віеł. Кгупісу“, што проці парляментарызму стаялі ўсе рэвалюцыянэры пачынаючы ад Маркса, і ўжывалі парлямант як трыбуну і толькі з часу нараджэньня рэвізыянізму — правыя сацыялісты пачалі лічыць яго за самамэту. А ўсе лявейшыя групы (і ня толькі камуністы!) стаялі й стаяць на папярэднім пункце і навет выносілі аб гэтым шматлічныя пастановы. Радзілі-б хоць-бы прыглядзецца да вельмі блізкай нашаму сельсаюз-хадэцкаму лягеру ўкраінскай „І.С.-Д. Р.П.“. Дык вось-жа трэба наперад павучыцца, чым выказваць свой „гумар“!

Арганізатар забастоўкі ў Лодзі. „Słowo“ з 6 г. м. падае проста сэнсацыйную вестку—быццам польскія ўлады арыштавалі на радава-польскім пагранічны нейкага Брайнбэрга, які быццам зьяўляецца арганізатарам работніцкай забастоўкі ў Лодзі і ехаў у Маскву здаць там справаздачу з прабегу забастоўкі. З дакумэнтаў, знойдзеных пры ім, быццам відна, што гэта быў адзін з сяброў групы, спэцыяльна дэлегаваны Радамі, дзеля кіраваньня забастоўкай.

Разам з ім арыштаваны і нейкі Аль

доў важыў, а цяпер на каго-ж я падобны?— Адны косьці засталіся!

Маўчала гэта, маўчала мая Агата ды раз і кажа. — Што ты, Рыгорка, сумуеш ды таеш, як васкавая сьвечка—схадзі ты лепш заўчасу да пана, пакарыся, папрасі, можа пачакае гэтых 300 залатовак? Няўжо-ж у яго душы чалавечай няма?

Пайшоў, опусьціўшы галаву, як злздзей які, ды плясь яму ў адну руку, у другую, кажу, панок, пачакай—няма скуль узяць!

— Нічога, кажа, я не магу зрабіць. Ты-ж у кантракце падпісаўся, а гэта ня жартачкі, гэта дакумант, права, закон. Вазьмі пажычку з рольнага банку.

А дзе ён гэты банк?—пытаюся.

— У Вільні—кажа. Але туды ехаць ня трэба. Напішы прашэньне, далучыш ад земскага ўраду пасьведчаньне аб тым, што купляеш зямлю і пашлі па пошце. А я ўжо, так і быць, пачакаю, пакуль не атрымаеш грошы—прынясі толькі квітанцыю.

Падзякаваў і за гэта, пакланіўся, рады, што хоць на нейкі час адвёў гэты абух ад сваёй галавы.

Назаўтра чуць дзянек паляцеў да адваката.

— А нашто табе—пытаецца — патрэбна пажычка гэта?

Пану, кажу, трэба плаціць за зямлю.

— Гм, кажа, на гэта вельмі трудна атрымаць? Напішам лепш, што будову якую рабіць будзеш.

— Якая, кажу, тут панок будова! Тут хоць ты гэту, якая ёсьць прадавай.

— Ну, тагды можна напісаць, на пасадку фруктовых дрэў, або на развядзеньне пчол.

— Садок, кажу невялічкі маю. Калі-ж ужо інакай ня можна, то пішы, панок, на пчолы—згадзіўся я. Напісаў. Сунуў яму ў зубы 10 ць залатовак і папёр у гэтае ж земства. Адтуль паслалі ў валасьць, тыя кажуць—шукай сьведкаў!—Лётаў я, лётаў, людцы мае, і чуць-чуць да вечара дабіўся парадку. Да аднаго прыйдзеш, стаіш-стаіш!—

Няма кажа, часу—пачакай!—а сам гавора з нейкай паненкай, сьмяецца, да другага—на абед пайшоў, думаў—нічога ня будзе. Ажна так-сяк павыбіраў усе паперы і на пошту. Іду дамоў, трымаю сьціснуўшы квітанцыю, каб ня згубіць, падлічыў, што залатовак 20-ць каштавала такі гэта справа — шкода! Добра, думаю, калі дадуць пазычку! Мусіць так праз месяца паўтара, прыносіць староста павестку з пошты. Віджу на грошы 500 зал.—дзякаваць богу! Ажна падскочыў я тут ад радасьці.

Як заплаціў пану, дык быццам з вастрогу вырваўся — вясёла стала, лёгка на душы. І Агата мая пачала гаварыць са мной, навет і пасьмяемся часам з чаго небудзь!

У гэты час зазванілі на мшу. Старэйшыя, састроіўшы набожныя сур'ёзныя міны, пашлі ў касьцёл.

— Пачакай, дзядзька Рыгор! Пасьпееш!—прасілі хлапцы. Дакончы апавяданьне! Яшчэ-ж мусіць адну частку трэба будзе плаціць пану?

Вот дык яно, дзеткі, што трэба, а дзе ўзяць, як выкруціцца і сам ня дам радыньні. Як падумаю—ажна галава баліць!

Прыдзецца палавіну гэтага кусочка прадаваць—нічога ня зробіш іначай! Што меў— ўжо прадаў, застаўся голы, як бізун.

Дык вось, як гэта лёгка купляць, як лёгка здабыць гэты кусочак, а яны кажуць—Добры!—Папрабаваў-бы другі, дык ведаў-бы як гэта смачна!

Ну, дзеткі, пайду пастаю трохі ў касьцёле, а ў другую нядзелю раскажу вам пра сваіх пчолкаў—цікавая гісторыя!

— А ты будзеш тут, дзядзька Рыгор?

Буду, буду! Прыйду! Тут сярод людзей хоць душу адвядзеш крыху.

— Абавязкава, дзядзька, прыдзі — мы чакаць будзем! — у дагон Рыгору крычалі хлопцы.

П. Асана.

герскі, пры якім быццам знойдзена шмат кампрамітуючых у шпігоўстве дакумэнтаў, як разьмяшчэньне польскага войска і г. д.

Працэс 10 камсамольцаў. 2 г. м. адбыўся працэс 10 камсамольцаў, за дэманстрацыю 1 студзеня 1926 г. проці Рэпрэзэнтацыйнага Палацу, дзе ваявода Рачкевіч якраз прыймаў высокіх урадоўцаў Польшчы. Засуджаны — Відунскі — на 6 гадоў, Лапкоўскі на — 4 г., Шэпс на — 3 гады, рэшта ад году да 6 месяцаў; адзін апраўданы.

У часе апошняга слова падсудных, старшыня суду быў адабраў голас прамаўляючаму Відунскаму, а калі і гэта не „памагло“, дык Відунскі быў выведзены з суду.

Арышт былога царскага ахвіцэра. У Вільні арыштаваны нейкі Локцік, былы ахвіцэр царскай арміі, які прыбыў у Вільню сёлета ўжніўні і быццам быў высланцам Менскага ГПУ. Локцік меў сувязь з расейскай эміграцыяй у Вільні і быццам меў бліжэйшы кантакт з антыбальшавіцкім „Брацтвам Рускай Праўды“ і высланымі з Польшчы ў сувязі з замахам на Лізарава (радавага прадстаўніка) расейскімі эмігрантамі-манархістамі.

У часе сьледзтва Локцік быццам прызнаўся на віны.

Ліквідацыя ячэйкі. Уночы 1 на 2 г. м., згодна з прэсавымі інфармацыямі, зьліквідавана камуністычная ячэйка ў в. Урванішкі, Валожынскага павету. У часе рэвізіі быццам знойдзена шмат камуністычнай літэратуры— як інструкцыі Ц.К., пісаных шыфрам і г. д. Арыштавана 14 чалавек, сярод якіх і пасланца „асобпосту“ ў Крайску.

Прозьвішчы арыштаваных і падрабязнасьці дзержацца ў сакрэце.

Яшчэ гэнаральная аблава. Надовячы польскія памежнікі зрабілі яшчэ адну гэнаральную аблаву на радава-польскім памежжы. Злоўлена 45 чалавек, сярод іх 7 камуністаў з неабходным „хвосьцікам“ — кампрамітуючымі дакумэнтамі.

Забастоўка вадаправодаў і электроўні ў Горадні. 28 мін. верасьня забаставалі гарадзенскія вадаправоды і электроўня. Прычына забастоўкі — выдаленьне некалькіх работнікаў і жаданьне работнікаў заключэньня новай зборнай умовы, якая ёсьць ужо ў работнікаў іншых гарадоў. Забастоўка трывала толькі 14 гадзін, бо магістрат „загварантаваў“ работнікам, што ім будзе заплачана за забастовачны час, што ніхто ня будзе звольнены і што будзе ў хуткім часе падпісана жаданая работнікамі новая зборная ўмова.

Работнікі пашлі да працы, аднак, прэса (K. W. № 226) лічыць, што перапынак забастоўкі ня ёсьць яго пэўная ліквідацыя.

Далейшая разбудова „Крэсаў“. Літоўскае „Жыце Люду“ ў № 18 падае, што польскія ўлады пастанавілі прыступіць вясной да разбудовы галоўнага судовага будынку ў Вільні. Далей газэта слушна заўважвае, што гэта, пэўне, адзіная ўстанова ў Вільні, якая стала разьвівaецца...

Разрухі ў Ашмяншчыне. Пад такім загалоўкам беларуса-жэрскае „буйна-абшарніцкае „Słowa“ з 5 г. м. піша наступную вестку аб тым, як сяляне грамадамі (tłumnie) нішчаць арыентацыйныя слупы і зарасьлі“.

Дзеля таго, што ўсякі пададзены намі факт, у родзе гэтага, польскія ўлады могуць залічваць да розных прэсавых і ня прэсавых праступкаў, як пашырэньне фальшывых веdamасьцяў, „podburzenie ludnosci“ і г. д., падаем гэты факт у буквальным перакладзе, засьцерагаючы чытачоў, што гэтая газэта бароніць буйна-абшарніцкія інтарэсы, а, значыць, і падае гэты факт у як найкарысьнейшым відзе для абшарнікаў, звальваючы ўсю віну на сялян.

„Ведаем, што ў часе існаваньня на абшарах усходніх ваяводзтваў Белар. „Грамады“, піша „Słowo“, караваліся неаднакратныя выступленьні сялян, якія пад уплывам вядзенай сыстэматычна агітацыі спраціўляліся проці праводжаньня „scalania“, грозна выступаючы проці ўрадоўцаў Земскіх Урадаў. Ліквідацыя „Грамады“ палажыла „крэс“ гэтым выступленьням і жыцьцё (для паноў, Рэд.) паплыло спакойна (як у раі! Рэд.). Сяляне ізноў зрабіліся „lojalnymi“ грамадзянамі дзяржавы і аб ніякіх выступленьнях, ні грамадзкіх, ні паадзінокіх нічога ня было чуваць. Толькі ўчора (4 г. м.) разышлася вестка, што ў маёнтку Даўляны, Дзевалiскай вол., Ашмянскага пав., выбух „бунт“ (!?) на грунце сваркі (sporu) за лес.

„Згодна з інфармацыямі „мерадайных“ крыніцаў, справа прадстаўляецца наступна.

На абшарах м. Даўляны, „уласнасьць“ маркграфіні Умястоўскай, знаходзіцца лес, так-званы Новая Пушча. На гэты лес, вярней на яго частку, гадавалі сабе прэтэнзіі сяляне. З мэтай выясьненьня справы на месца прыехалі землямеры. Зрабілі памеры, паставілі арыентацыйныя слупы і тады прыйшлі грамадою (tłumnie) азброеныя сякерамі і каламі сяляне і, прагнаўшы мерачых, зьнішчылі арыентацыйныя слупы і пацерабілі зарасьлі. Сітуацыя зрабілася паважнай. Інтэрвэнцыя Старасты не дала пажаданага рэзультату і тады ён загадаў прыслаць туды „большы лік“ паліцыі, дзеля забясьпечаньня ладу і недапушчэньня дзеля далейшага нішчэньня маладога лесу.

„Арыштавана трох „найгарліўшых падпальшчыкаў“ („podżegaczy—агітатараў“) аднак і гэта не памагло, бо пасьля гэтага да „авантуруючых“ сялян салідарна далучылася суседняя вёска„.

Гэты факт адбыўся 1 г. м. і дзеля таго, што да ўчарашняга дня сітуацыя ня высьнілася, ваявода выслаў на мейсца надкамісара Канорко, які „збадае“ справу на мейсцы“.

Адказ Віленскага Ваяводы у справе пасольскіх мітынгаў.

9 кастрычніка паслыасталі наступнае заведамленьне:

WILEŃSKI
URZĄD WOJEWÓDZKI
Wydział Bezpieczeństwa
Wilno, dn. 9/X 1928 r.
L. V 4895

DO PANA JÓZEFA GAWRYLIKA
POSŁA NA SEJM
Wilno, ul. Piwna Nr. 9.

W. p. . . . .
L. . . . . .
Przedmiot:

DECYZJA GŁÓWNA.

Na podstawie art. 72 Rozporządzenia Prezydenta R. P. z dn. 22 maja 1928 r. (Dz. Ust. R. P. Nr. 36 poz. 341) o postępowaniu administracyjnem i na podstawie art. 1 Rozporządzenia Kom. Gen. Z. W. z dnia 25. V. 1919 r. (Dz. Urz. Z. C. Z. W. Nr. 5 poz. 30 ex 1919) podanie Pana z dnia 8. X. 1928 r. w sprawie zezwolenia na urządzenie wieców sprawozdawczych, mających się odbyć w dn. 11. X. r. b. w. Głębokiem pow. Dziśnieńskiego, w dn. 16. X. r. b. w Kurzeńcu pow. Wilejskiego i w dn. 18. X. r. b. w Dołhinowie pow. Wilejskiego, na których mieli przemawiać p. p. pos. Józef Gawrylik, Flegont Wołyniec i Ignacy Dworczanin—uchylam.

Od powyższej decyzji na podstawie art. 76 wspomnianego wyżej Rozporządzenia o postępowaniu administracyjnem przysługuje Panu prawo odwołania się do Min. Spr. Wewn. za pośrednictwem Wileńskiego Urzędu Wojewódzkiego w 14-dniowym terminie od daty otrzymania niniejszej decyzji.

Za Wojewodę, Naczelnik Wydziału Kirtiklis.

Паслы будуць рабіць інтэрвэнцыю ў Міністэрстве.

КАРЭСПАНДЭНЦЫ.

Нашы „адбудоўцы“.

Сёлета вясной у Браслаўі, адчынена была бетанярня, кіраўніком якой ёсьць: „пан рэфэрэнт адбудовы краю“ — нейкі Тадэуш Бэйнар. Гэты самы „пан рэфэрэнт“ пэўне толькі чуў пра бетонныя вырабы, а як іх робяць, дык ня ведае, бо ані якага ня мае паняцьця аб бетоне і толькі псуе матар'ял, „практыкуючысь“ коштам і працай бедных работнікаў, узваліваючы ўсю віну на апошніх.

Гэтак, „пан рэфэрэнт“, загадаў работнікам, каб толькі што зробленыя сырыя ходнікі (пліты на тратуары) мачыць у возера, каб „мацаваліся“. Работнікі загад выканалі. Але праз пару дзён з гэтых ходнікаў вышаў „пшык“. Яны ў вадзе распаўзьліся. Аж за валасы хапіўся „пан рэфэрэнт“, гледзячы на „плады“ сваей практыкі. Як апалелы, залетаў па бетанярні, лаючы нявінных работнікаў. — „Пся крэў, вы мне матар'ял папсулі, повыпэндзам вшысткіх, не заплацэн ані гроша і г. д., перасыпаючы сваю лаянку адборнымі „моцнымі слаўцамі“ (на што ён вялікі мастак і аматар). Але, баючыся, каб не дайшлі чуткі аб яго „практыках“ да вушэй самога старасты, зрабіў лоўкую „камбінацыю“ з рахункамі і... вышла чыста гладка, што і камар носа ня ўткнець. Работнікі атрымалі сваё (хаця далёка ня ўсё) і пан рэфэрэнт вышаў чысты. І шмат гэткіх „цудаў тэхнікі“ нарабіў „пан рэфэрэнт“, псуючы матар'ял (для практыкі), застаўляючы работнікаў па некалькі разоў, рознымі спосабамі перарабляць тую самую работу. І няведама, дакуль-бы йшло гэта „практыкаваньне“, каб не работнік-фаховец, з Опса, Пяткевіч, які паказаў правільны спосаб прыгатаўленьня бетону.

Гэты самы „пан рэфэрэнт“ займаецца таксама (практыкуецца) і „адбудовай“ нашых „крэсаў“. Гэтак у в. Сіпавічы, Богінскае гм., у селяніна Філіповіча збудавалі пад яго (рэфэрэнта) кіраўніцтвам глінабітны дом, сьцены якога на другі год распаўзьліся.

Ці-ж не паход гэта заходняе культуры на „дзікі“ Усход? „Работнік“.

Дзіўная „ласка“.

(Вёска Азіраўцы, Браслаўскага павету).

У маёнтку Бэльмонтах жывець „пан адміністратар“ Дабравольскі. Гэты „пан адміністратар“ вельмі любіць (як і ўсе паны) калі перад яго „яснавяльможнай“ асобай „хлопы“ зьнімаюць шапкі. Праяжджаючы праз вёскі, заўсёды дзеліць ён дзецям цукеркі, якія кажуць яму „дзень добры“ ці цалуюць у руку. І гэта „ласка“ зусім не перашкаджае „пану адміністратару“ загадываць сваім гаёвым „стшэляць шроцікем в пенты“ гэтым самым бедным сялянскім дзеткам за грыб ці за ягадзіну, сарваную ў яго лесе.

Дзіўная твая „ласка“, „пане адміністратар“! Ці ня хочаш ты, панок, цукеркамі заваяваць сабе пашану сярод сялян, і прасьліць „добрым панам“? Ці можа табе прыемна бачыць, як галодныя і абдзертыя сялянскія дзеткі кідаюцца за тваімі цукеркамі? Цябе, панок, сьмех бярэ, гледзячы на нашу беднату. Табе гэта ражрывак у тваім панскім задаволеным жыцьці. Сьмейся, панок! На тваей вуліцы сягоньня сьвята!

„Селянін“.

„Samorząd i wycieczka“.

(Скідэльская гміна, Горадзенскага павету).

Ня вельмі даўно з нашае гміны адправілася на чале з войтам вясёлая кумпанія на выстаўку „krajowego gospodarstwa“ ў Беласток. Паехала ўсяго 36 чалавек; частка з іх радныя, частка — солтысы, а частка і так „прысьцябнуўшыхся“ ахвотнікаў. На аплату гэтай падарожжы войт з гміннай касы асыгнаваў 500 злотых. Па прыезьдзе з выстаўкі, на запытаньні зацікаўленых сялян аб тым, што яны бачылі на выстаўцы, езьдзіўшыя апавядалі аб тым, што на іх зрабіла найбольшае ўражаньне. І вось цікавыя вынікі іх гутарак. Радны, Юрка Літвін, расказваў: „як толькі яны ўзышлі на выстаўку, радыё як разнула „русского“, да так правільна па „кацапску“, што ногі самы падымаліся скакаць“. На запытаньне, што ён больш бачыў, адказаў, — што многа, многа розных рэчаў, так што аб усім не разкажаш і больш не сказаў нічога. Другі „ездок“, з „прысяжных“, Міхась Гуліда, бачыў крыху больш; гэты, апрача радыё, голасна крычаўшага, так голасна, што чуваць было за тры вярсты, бачыў яшчэ адну рэч, — маторную церніцу, якая ў дзень вычірае больш 30 пудоў лёну. Каштуе вельмі танна бо толькі... 500 даляраў. Інструктар, які раз'ясьняў карысьць гэтай машыны, казаў — што, каб задаволіць матар'ялам гэту машыну, трэба сеяць 150 гэктараў лёну; так што нашаму селяніну набыць гэту машыну дзеля яе „таннасьці“ і неабходнага ліку матар'яну, на жаль, ня прыдзецца. Другі радны, Цецько Рыгор, ён-жа сябра павятовага сойміку, ён-жа сябра „павятовага выдзелу“, гэты спазьніўся ехаць разам з „вышчкоўцамі“, так што прышлося ехаць на свой уласны кошт; гэтаму так і ня прышлося „многа“ бачыць, бо здолеў толькі забегчы на выстаўку і купіць сабе „вечнае пяро“ за 40 гр. (у звычайнай прадажы 8 — 10 гр.) і прыладу, каторая — рэжа шкло, точыць нажы, ножніцы—за паўтара злота (звычайна 1 зл.), але ёю ня толькі рэзаць, навет біць шкло добра немагчыма.

З усіх гэтых гутарак (а каб апытаў усіх учасьнікаў выцечкі, то яшчэ ясьней і цікавей было-б) відна, усё роўна, як у тэй байцы Крылова—толькі наадварот, што на ўсей выстаўцы ня было жаднай „букашкі ці таракашкі“, якая магла-б ужыцца на карлаватай сялянскай гаспадарцы.

Паўстае пытаньне, дзеля якой мэты было выдана 500 злотых, калі нічога карыснага для селяніна ня было. Ці ня час ужо зразумець, што паны здольны паказваць толькі сваю „потэнгу“, а нашу, сялянскую, саўсім не дапусьцяць, як гэтаму яскрава сьведчыць факт „Спадароўскага беларускага кутка“ на „наўкочным кірмашы“ ў Вільні, гэтага „фарсу“ беларускай культуры і то запхнулі яго недзе ў цёмны куток.

„Мазоль“.

Нам пішуць з вёскі яшчэ, што:

✕ **Борна-Гічыцкая гм., Косаўскі пав.** Часта ў сялянска-работніцкай прэсе чытаеш аб тым, што тая ці іншая гмінная рада ўхваліла дапамогу Беларускім Гімназіям. Зусім ня тое ў нашай гміне. Нашы радныя баяцца аб гэтым навет заікнуцца, ня хочучы страціць ласку ў паноў.

Браты! Ад імя працоўных мас раджу вам кінуць гэта і на першым-жа паседжаньні ўхваліць дапамогу ўстановам, з якіх выйдуць будучыя барацьбіты за працоўны народ! Ня бойцеся страты ласкі ў паноў! Падумайце лепш аб тым, як вы будзеце глядзець у вочы пасьля гэтага братом, якія вас выбралі, паміж якіх вы будзеце заўсёды жыць! Акамятайцеся! Гэтага чакае ад вас узбуранае сумленьне працоўных масаў!

Г. Лапцёў.

✕ **Вёска Ярнява, Старавейскай гм., Слонімскага павету.** Радасна заўважыць, як вёска за вёскай усьведамляецца і ідзе на барацьбу за вызваленьне. Радасна заўважыць, як шчыльнеюць рады нашай арміі. Вынятак з гэтага робіць наша вёска. Сяляне, абаламучаныя асабістымі спрэчкамі, адхіляюцца ад барацьбы за лепшае заўтра, ня чуюць здаровых заклікаў роднай газэты, а пакорна цягнуць лямку цемнаты. Нядаўна жыхары гэтай-жа вёскі, Макар Касьпэрчык і Даніла Чак, пасварыліся за дзікія грушкі на полі і моцна пабіліся на нажы. Вынікам бойкі было тое, што Д. Чака бяз прытомнасьці адвязьлі ў шпіталь, дзе яшчэ і цяпер змагаецца з сьмерцяй. Вось, браткі, вынікі цемры! Ці-ж не пара нам гэта кінуць?! Ці-ж не пара працёрці вочы і цьвяроза глянуць на жыцьцё?! Успомніце словы нашага песьняра Я. Коласа:

„Ці-ж мы, хлопцы, рук ня маем,
Ці-ж нам сілы бог ня даў,
Ці-ж над нашым родным краем
Луч свабоды ня блішчаў?
Выйдзем разам да работы,
Дружна станем, як сьцяна,
І прачнецца ад дрымоты
З намі наша старана“!

Дык годзе спаць! Хай праменьні сьвядомасьці прасьвецяць нам сьцежкі жыцьця і дадуць сіл узяцца за карысную працу, якой мы скінем адвечнае ярмо і зможам парваць ланцугі цемры, што апуталі нас з галавы да ног. Да працы! М. К.

✕ **В. Дзедзіна, Тамілаўскай вол., Дзісьненскага павету.** Абшарнік Славінскі стаў даваць сялянам лес на падчыстку, падбіраць тонкае, гнілое гальлё. Аднак, калі няма нічога лепшага,—добра і гэта. Удадатку пан, аддаючы гэты лес на падчыстку, казаў, што сялянам за працу яшчэ прыплоціць. Вось і ўзяліся нашыя гаротнікі за працу. Але сталася інакш. Пан прыслаў адбіваць гальлё свайго вернага служку Юшкевічт, які зажадаў замест даплаты сялянам, прыплаты ад іх на карысьць пана. Сяляне-ж, шкадуючы працы, споўнілі панскі выбрык і заплацілі.

З выдавецкае Нівы.

Як даведваемся на днях выходзяць з друку наступныя кнігі розных беларускіх выдавецтваў:

1) Адрыўны Календар на 1929 год.

2) М. Гнатышак. З мастацкай прозы сучаснае Нямеччыны.

3) „Рунь Веснаходу“ — зборнік вершаў і прозы паэтаў і пісьменьнікаў Зах. Беларусі — А. Бартуля, Н. Арсеньневай, Х. Ільляшэвіча, М. Васілька, Ляо-Дзе, Зьвястуна, Машары, Шкодзіча, Камара, Сяргіевіча, Вялецкага і Алесі Ц.

4) „Судны дзень“ — У. Караленкі ў перакладзе В. Грыцянкі.

Друкуецца:

1) Календар-кніжка на 1929 год.

2) К. Каўцкі. Найміты ў сярэдніх вяках.

3) „Тутэйшыя“ — драма Я. Купалы ў 3-х актах.

4) Некалькі паасобных рамансаў для сцэны.

Лісьмо у Рэдакцыю.

Паважаны Грамадзянін Рэдактар!

Прашу зьмясьціць у Вашай паважанай газэце наступнае:

У часе выбараў у Сойм Рэчыпаспалітай Польскай ў 1928 г. ў Наваградчыне стварылася арганізацыя пад назовам „Беларусы Сяляне і Работнікі“, якая выставіла свой сьпісак № 41.

Павадыр гэтае арганізацыі М. Чатырка і паўнамочнік гэтага сьпіску М. Вінцукевіч у той час дакляроўвалі, што будуць моцна бараніць інтарэсы беларускіх сялян і работнікаў.

На закіды люднасьці аб супрацоўніцтве іх з Янкам Станкевічам яны давалі розныя адказы, што як з ідэалёгіяй так і асобай яго нічога супольнага ня маюць, а заўсёды будуць трымацца згодна ідэалёгіі „Беларускіх Сялян і Работнікаў“.

На выбарах сьпісак № 41 праваліўся, не дастаўшы ніводнага мандату і цяпер, калі ў Сойме ёсьць Беларускі С.-Р. Клюб, аб якім яны нібы лятуцелі, гэтыя асобы не пайшлі з ім, а сталі адкрыта разам з Янкам Станкевічам баламуціць народ, творачы розныя арганізацыі, як нейкія „зьвязы“ і „млечарні“, стараючыся рознымі спосабамі адцягаць людзей ад працы на карысьць працоўнага народу. Пераканаўшыся ў здрадзе М. Чатыркі і яго памочнікаў, гэтым заяўляю, што нічога супольнага з імі ня маю і таксама прызываю ўсіх чэсных людзей, якіх яны ашуканчым спосабам уцягнулі ў свае арганізацыі, кінуць з імі сувязь, а йсьці толькі з „Беларускім Сялянска-Работніцкім Клюбам“, які ёсьць шчырым абаронцам нашых інтарэсаў. З пашанай

28-IX 1928 г. **Мікалай Герус.**

Ад Рэдакцыі. Ад сябе паведамляем, што М. Вінцукевіч цяпер працуе ў Янкаўскім „Гаспадарчым Зьвязе“, а М. Чатырка разам з А. Каўшом і іншымі на адбытым Мітрапалітальным зьездзе самахоць увайшлі ў склад Камісіі па скліканьню праваслаўнага Сабору. Што гэта азначае—хіба-ж сяляне і работнікі ведаюць.

Рэдактар-Выдавец: П. Пяткун.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.